Мінску адбылася канферэнцыя «Народныя паясы: мастацтва і рамяство». Выдадзены зборнік матэрыялаў канферэнцыі.

На сённяшні дзень паясамі займаюцца ўсюды, ад гурткоў ў Дамах рамёстваў, школ да вышэйшых навучальных устаноў.

Трэба адзначыць, што пад агульнай назвай «Беларускія народныя паясы» вядома каля дзесяці тэхнік (спосабаў) іх вырабаў: ёсць паясы вітыя, плеценыя і тканыя «на ніту», тканыя на дошчачках, вывезаныя на калодачцы.

У гэтых тэхніках можна рабіць паясы, жгуты, тасьму рознага выгляду: плоскія і круглыя, гладкія і шурпатыя, з арнаментам розных ступеняў складанасці і без арнаментаў.

Можна вызначыць некалькі напрамкаў у рабоце з паясамі; кожны напрамак патрабуе іншага падыходу і можа быць выбраны студэнтамі па іх жаданню.

Першы напрамак -- выраб аўтэнтычных паясоў, г.зн. з традыцыйным арнаментам, у традыцыйных колерах (чырвоны - шэры - белы). Такія паясы вельмі працаёмістыя, але тут можна абысціся без вялікіх мастацка-творчых намаганняў. Аўтэнтычныя паясы добра спалучаюцца з традыцыйным народным адзеннем.

Другі напрамак -- выраб сучасных сувенірных паясоў, якія могуць быць шматкаляровымі, са складаным аздабленнем на канцах. У гэтым напрамку ёсць прастора для арнаментальнай творчасці.

Трэці напрамак -- выраб паясоў-дадаткаў да сучаснага адзення. Гэты напрамак патрабуе разумення касцюма як адзінага ансамбля, здольнасці працаваць на нюансах колераў і форм. Магчыма, гэты напрамак самы цяжкі з трох: трэба трымацца ў русле моды, пры гэтым ствараць нешта арыгінальнае.

Чацвёрты напрамак блізкі да трэцяга -- выраб сумак, біжутэрыі, тасьмы як дадаткаў да сучаснага адзення.

Пяты напрамак -- пано ў змешаных тэхніках. Такія пано набліжаюцца па сваіх задачах да стварэння габеленаў і могуць стаць добрым матэрыялам сумеснай работы ў галіне ткацтва і габелену.

Шосты напрамак -- стварэнне лялек з выкарыстаннем паясоў і жгутоў. На нашу думку, гэта вельмі цікавая тэма, якая дазваляе студэнтам напрацаваць матэрыял для далейшай работы ў школе.

Галоўны прынцып стварэння лялек -- простая канструкцыя, сшытая з тканіны, у спалучэнні са складаным дэкорам з паясоў, жгутоў і г.д.

Такія лялькі могуць быць і ў выглядзе міфалагічных істот, жывёл.

Розныя напрамкі маюць розныя ступені складанасці, гэта дае кожнаму студэнту магчымасць выбару ў залежнасці ад яго падрыхтоўкі і творчых схільнасцей. Мы лічым, што магчымасць выбару спрыяе развіццю творчых здольнасцей студэнтаў.

**Шаура Р.Ф.,**
дацэнт

## ПЕРСПЕКТЫВА Ў МАЛЮНКУ І ЖЫВАПІСЕ І ЗНАЧЭННЕ ЯЕ Ў ФАМІРАВАННІ ТВОРЧАЙ АСОБЫ

Сёння, напэўна, цяжка адшукаць чалавека, які б у сваім паўсядзённым жыцці не сустракаўся з мастацтвам -- з жывапіснымі ці графічнымі творамі ў галерэях, музеях, палацах мастацтва ці з манументальнымі творамі ў маштабах горада, пасёлка,як, напрыклад, мазаічнымі пано, роспісам і г.д. І, бадай, кожны раз, калі людзі паглыбляюцца ў свет мастацтва, яны нібыта самі на якую-небудзь хвіліну становяцца ўдзельнікамі тых падзей, якія адлюстроўваюцца ў жывапісным палатне ці графічным лісце. Так, часам усхвалявана, пераканаўча, праўдзіва мастак перадае ў сваім творы пэўны эпізод дзеяння ці разгортвае панараму пейзажу, які да глыбіні хвалюе сэрца чалавека. Але якімі сродкамі мастак дабіваецца такой «праўдзівай ілюзорнасці» ў сваіх творах? Такіх сродкаў шмат існуе ў выяўленчым мастацтве; адным з іх з'яўляецца веданне правілаў і законаў перспектывы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Перспектыва, як навука, узнікла ў Італіі ў XV стагоддзі з практыкі італьянскіх мастакоў. Тэорыя перспектывы ўжо выказвалася мастакамі П'етра дэль Борга, Леанарда да Вінчы, Андрэа Поцца, нямецкім мастаком Альбрэхтам Дзюрэрам. Пытанні перспектывы распрацоўвалі і рускія мастакі: Ласенка, Венецыянаў, Заранка, Ге, Паленаў.

Слова «перспектыва» азначае здольнасць правільна, добра бачыць. Вока чалавека бачыць своеасабліва: тое, што блізка, здаецца большым, тое, што далей знаходзіцца ад гледача, – меншым; у выніку форма прадметаў успрымаецца не такой, якая ёсць на самой справе, а скажонай. Гэту «скажонасць» форм прадметаў называюць «перспектывай», а відарыс, зроблены так, як ён бачыцца вокам, -- «перспектыўным».

Веданне асноў перспектывы, перспектыўных маштабаў і спосабу карыстання імі дазваляе мастаку будаваць малюнак правільна, выразна, пераканаўча. Таму праграмай па малюнку на спецыялізацыі «народныя рамёствы» прадугледжаны цэлы комплекс заданняў па грунтоўнаму засваенню правілаў перспектывы. Менавіта з першых заняткаў па малюнку на першым курсе прапануюцца прадметы і пастаноўкі на пабудову. Студэнты выконваюць заданні ўжо ведаючы асновы пабудовы і перспектыўнага скарачэння ў малюнку. Але гэта бадай што на ўзроўні мастацкай школы ці спецыялізаванага вучылішча яны могуць карыстацца невялікім, элементарным багажом ведаў у гэтам накірунку. Патрабаванні ж вышэйшай установы ў галіне мастацтва (у прыватнасці, у малюнку, кампазіцыі, дэкаратыўнапрыкладной творчасці) -- гэта перш за ўсё атрыманне студэнтамі прафесійных ведаў. Пасля заканчэння курса навучання творча працаваць ці выкладаць народнае мастацтва ў школе, дамах рамёстваў можна толькі пры наяўнасці неабходнага асабістага патэнцыялу ведаў у гэтай галіне.

Трэба адзначыць, што малюнак на спецыялізацыі выкладаецца на працягу чатырох гадоў таму, што гэтая дысцыпліна арганічным кампанентам уваходзіць ва ўсе іншыя прадметы і дысцыпліны спецыяльнага цыкла. Вядома, што любая работа ў вучэбнатворчым працэсе пачынаецца менавіта з малюнка, ад першай праведзенай на паперы лініі, штрыха і да закончаных графічных лістоў мастацкай значнасці. Пэўнай падмогай у засваенні праграмы па малюнку з'яўляецца асобны тэарэтычны курс «Асновы перспектывы». У ім сканцэнтраваны тры асноўныя раздзелы: лінейная і паветраная перспектыва, асновы тэорыі ценяў і правілы люстраных адбіткаў. Тэарэтычны курс дае магчымасць вывучаць правілы і законы пабудовы прадметаў, стварэння кампазіцый у залежнасці ад месца размяшчэння прадметаў, іх асвятлення, тонавай і каларыстычнай насычанасці. Гэта навука складаная, але вельмі важная і неабходная ў мастацкім, творчым працэсе.

Пабудова куба, прамавугольніка, прадметаў са сферычнай паверхняй (асобна ці ў кампазіцыйных пастаноўках) на практычных занятках студэнтаў вядзецца на працягу семестра. Вопыт і практыка правядзення заняткаў па малюнку паказваюць, што правільна будаваць вышэй упамянутыя прадметы з пункту гледжання перспектывы студэнты нярэдка не могуць не толькі пасля заканчэння мастацкай школы, але і пасля заканчэння вучылішча. Трэба папаўняць прабел ужо ва універсітэце, што патрабуе дадатковага часу на рэалізацыю настаўленых праграмай задач.

Для больш глыбокага засваення законаў лінейнай і паветранай перспектывы ў навучальным працэсе прадугледжана выкананне заданняў па накідах. На першым курсе даюцца заданні больш простага зместу (накіды бытавых прадметаў, садавіны, гародніны, накіды дрэў зімой і летам і г.д.), на старшых курсах студэнты выконваюць накіды фігуры чалавека, жывёл. Таму, апрача асноўнай праграмы і заданняў для самастойнай працы, студэнты на працягу ўсяго навучальнага працэсу паступова набываюць уменні і навыкі ў малюнку. Такіеякампаненты, як кампазіцыя, лінейная і паветраная перспектыва, прапарцыянальныя суадносіны дэталяў, фактура матэрыялу, адпрацоўваюцца паступова, па прынцыпу «ад простага да

складанага». І толькі на чацвёртым курсе гэтыя кампаненты быццам акумулююцца ў выніковыя заданні па маляванню партрэта і фігуры чалавека. Хаця падрыхтоўка спецыяліста акадэмічнага накірунку ў мастацтве і не прадугледжана праграмай спецыялізацыі, грунтоўныя веды па малюнку і па другіх дысцыплінах, якія здольны фарміраваць менавіта творчую асобу, могуць і павінны быць галоўным арыенцірам у падрыхтоўцы будучых кваліфікаваных спецыялістаў.

**Трусаў А.А.,**
дацэнт

## ВУЧЭБНЫ МУЗЕЙ УНІВЕРСІТЭТА -- ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ САМАВЫЗНАЧЭННЯ СТУДЭНТА ЯК КРАЯЗНАЎЦА

Краязнаўства -- важная галіна гуманітарнай адукацыі кожнага чалавека, якая выхоўвае любоў да сваіх каранёў, да сваёй малой радзімы.

Загадам рэктара ад 15 лістапада 1995г. створаны вучэбны музей, прысвечаны гісторыі матэрыяльнай культуры беларускага народа. Стварэнне музея -- важны крок у выхаванні студэнтаў як патрыётаў сваёй Бацькаўшчыны, людзей, дасведчаных у гісторыі свайго горада, вёскі альбо мястэчка.

Пры гэтым музей можа выконваць некалькі функцый у стварэнні строгай сістэмы краязнаўчых ведаў.

1. Памяшканне музея можа выкарыстоўвацца як месца часовых экспазіцый розных музеяў Беларусі, а таксама прыватных збораў беларускіх і замежных калекцыянераў. Пры гэтым кожная такая экспазіцыя будзе мець спецыяльны стэнд, прысвечаны гісторыі таго ці іншага музея ці прыватнай калекцыі. Кожная студэнцкая група павінна наведаць гэтую выставу і студэнтам будзе прапанавана выкарыстаць атрыманыя веды пры напісанні курсавых і дыпломных работ.

2. Навуковая рада музея распрацоўвае і прапануе кожнаму студэнту і выкладчыку навуковыя рэкамендацыі па збору экспанатаў для будучага музея. Для прапаганды і заахвочвання гэтай работай у музеі заўжды будзе існаваць выстава пад назвай «Новыя музейныя паступленні». Кожны прадмет, прынесены студэнтам ці выкладчыкам, будзе мець падрабязны навуковы пашпарт, напісаны чалавекам, які здаў экспанат у музей.

3. У памяшканні музея будуць арганізаваны прэс-канферэнцыі і сустрэчы музейных работнікаў розных рэгіёнаў Беларусі з журналістамі, студэнтамі і выкладчыкамі універсітэта.

4. Могуць быць арганізаваны выставы, што складаюцца з аднаго экспаната. Гэта выставы адной карціны, скульптуры, аднаго помніка архітэктуры, паштовай маркі і інш. Дзякуючы такім выставам кожны студэнт можа зразумець каштоўнасць канкрэтнага музейнага экспаната, яго ролю ў стварэнні гісторыка-культурнага асяроддзя ў музеі.

**Лапіна С.В.,**
прафесар

## САЦЫЯЛАГІЧНАЕ ТЭСЦІРАВАННЕ Ў СТУДЭНЦКАЙ АЎДЫТОРЫІ

Сярод сацыялагічных метадаў атрымання першаснай эмпірычнай інфармацыі тэсціраванне стаіць асобна. Гэты метад даволі складаны, ён патрабуе ад тых, хто яго прымяняе, адносна высокай кваліфікацыі і практычных навыкаў у галіне сацыялагічных даследаванняў, а таксама значнага часу на падрыхтоўку тэстаў, іх апрабаванне, а затым апрацоўку атрыманых вынікаў. Але ўсе складанасці адыходзяць у бок, калі аналізуеш эфектыўнасць гэтага метаду. ён заўжды дае малюнак вывучаемай з'явы ў сувязі з івадавочным эталонам. Таму ён можа расцэньвацца не толькі як метад збору інфармацыі, але і як вымярэнне вывучаемай з'явы.

Пытанне аб выкарыстанні тэсціравання ў студэнцкай аўдыторыі ўзнікла ў сувязі з пошукамі больш аб'ектыўных фактараў і найбольш эфектыўных метадаў ацэнкі ведаў студэнтаў . Аб'ектыўная адзнака, да якой з



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ